Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Сведкі ў пагонах хаваліся за шырмай. У Гродне за счэпку ў "Маршы адзінства" да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" асудзілі 62-гадовую прыбіральшчыцу

11.11.2021 **Тэгі**: суды, свабода мірных сходаў

**Справу разглядаў суддзя Дзмітрый Кедаль, дзяржаўнае абвінавачванне падтрымлівала Алена Пранько. На самым пачатку судовага разгляду пракурорка зачытала хадайніцтвы супрацоўнікаў міліцыі, якія прасілі дапытваць іх за шырмай, бо "ў выпадку пазнавання тыя асцерагаюцца за сваё жыццё і здароўе".**

Адвакат абвінавачанай быў супраць. Як ён выказаўся, яго *"падабаронная не з'яўляецца сяброўкай тэрарыстычнай арганізацыі, і падобныя заявы павінны быць чымсьці абгрунтаваны"*.

І ўсё ж суддзя задаволіў хадайніцтва сведкаў.

Паводле версіі абвінавачвання, 6 верасня 2020 года ў 13.20 прыбіральшчыца з "Гродна-Азоту" Яніна Глазкова, *"усведамляючы супрацьпраўнасць сваіх паводзінаў і натхняючы навакольных, стала актыўным удзельнікам групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, парушыўшы патрабаванне закона "Аб масавых мерапрыемствах"*.

Яніну Баляславаўну абвінавацілі ва ўдзеле ў "Маршы адзінства", на правядзенне якога ад уладаў не было атрымана дазволу.

Таксама, паводле версіі дзяржабвінавачвання, падсудная не падпарадкоўвалася загадам прадстаўнікоў міліцыі, якія спрабавалі спыніць супрацьпраўныя дзеянні людзей і, *"па папярэдняй змове з іншымі нявысветленымі асобамі працягнула заклікаць грамадзян да групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак"*. Вынікам дзеянняў жанчыны, на думку пракурора, сталася тое, што пратэстоўцы ўтварылі счэпку.

Калі слова далі Яніне Глазковай, яна распавяла, што ў той дзень на месца падзей трапіла выпадкова. Насамрэч у той дзень яна выйшла з дома ў Фарны касцёл, каб замовіць імшу — у той час яна даглядала хворага бацьку. Таксама жанчына адзначыла, што загадзя не ведала пра падзеі, што адбываліся ў горадзе, таму што нядаўна ў яе памёр брат, а на руках быў хворы бацька і муж з трэцяй групай інваліднасці.

На пытанне пра тое, як яна апынулася ў счэпцы, падсудная растлумачыла, што гэта адбылося спантанна і што за рукі яе падхапілі пасля таго, як міліцыя пачала затрыманні. Пасля ўдакладняльных пытанняў адваката Яніна Баляславаўна сказала: *"Калі б загадзя ведала пра акцыю, у той бок бы ў той дзень не пайшла"*.

**"Падышла да акцыі з жаночай цікаўнасці"**

Пытанні падсуднай задаў і суддзя. Так, напрыклад, ён пацікавіўся, што менавіта тая выкрыквала, стоячы ў счэпцы і пляскаючы ў далоні. Жанчына растлумачыла, што крычала штосьці падобнае да слова *"прапусці"*, бо ёй здавалася, што калі яна будзе рабіць тое самае, што і астатнія, міліцыя іх прапусціць і не будзе перагароджваць рух.

> *"У касцёл у выніку схадзілі?"* — удакладніў суддзя.
>
> *"Не, у той дзень у такім стане ў касцёл я ісці не змагла. Паспрабавала хутка сысці з месцаў падзеі. Імшу ў выніку замовіла сястра, а праз тры дні тата памёр",* — адказала жанчына.

За шторкай у зале суда тым часам сядзелі сведкі — **Ангеліна Нагорная**, **Мікалай Задоеў** і **Сяргей Цімафееў**. Гэта супрацоўнікі міліцыі, якія ў той дзень працавалі каля месца правядзення "Марша адзінства".

Нагорная распавяла, што ў той дзень яна *"ажыццяўляла ахову грамадскага парадку ў сувязі з атрыманнем інфармацыі пра тое, што каля філармоніі збяруцца грамадзяне, не згодныя з выбарамі, і хочуць у знак пратэсту прайсці калонай па цэнтры горада"*. Сведка ўдакладніла, што ўдзельнікі маршу перагарадзілі дарогу і перашкаджалі руху транспарту. Пры гэтым па гучнагаварыцелях прадстаўнікі ўлады папярэджвалі людзей пра крымінальную і адміністрацыйную адказнасць за парушэнне грамадскага парадку і прасілі разыйсціся.

Таксама сведка Нагорная распавяла, што ў пратэстоўцаў з сабой былі бел-чырвона-белыя шары, стужкі, транспаранты, яны выкрыквалі "Жыве Беларусь", а некаторыя спрабавалі сарваць маскі з супрацоўнікаў міліцыі і хапаліся за форменнае абмундзіраванне.

Адвакат адзначыў, што сведка дала выбарчыя паказанні адносна абстаноўкі, якая склалася той дзень, і падкрэсліў, што сведка не можа назваць дакладнага месца свайго знаходжання ў момант, калі ўдзел у масавым мерапрыемстве ўзяла падсудная.

Сведка Задоеў таксама не змог удакладніць свайго месцазнаходжання ў той дзень. Сказаў толькі, што *"нёс службу ў розных частках горада, дзе знаходзіліся каля 150 грамадзян, якія прымалі ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве"*. Ён жа распавёў суду, што ў той дзень людзі стаялі ў счэпцы і ігнаравалі заклікі міліцыі разыйсціся. Саму Яніну Баляславаўну Задоеў не пазнаў. **Пацвердзіць, што ў счэпцы стаяла менавіта яна, міліцыянт не змог.**

Сведка Цімафееў распавёў, што пасля выкрыквання лозунгаў удзельнікі масавай акцыі пратэсту пайшлі яшчэ і на сілавое сутыкненне з супрацоўнікамі міліцыі.

Падчас спрэчак пракурорка падкрэсліла, што ў справе яна не ўгледжвае ані змякчальных, ані абцяжарвальных віну жанчыны акалічнасцяў, папрасіла суд прызнаць Яніну Глазкову вінаватай у злачынстве паводле арт. 342 КК РБ і запатрабавала для яе пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на тры гады.

Адвакат абвінавачанай настойваў на апраўдальным прысудзе, паколькі паказанні сведак супярэчаць відэазапісу, які бакі маглі бачыць падчас вывучэння пісьмовых матэрыялаў справы.

> *"Доказаў, якія сведчаць пра віну маёй падабароннай, не здабыта, матываваць бяздоказны прысуд нельга. Таму гаворка пра справядлівасць становіцца эфемернай. Прашу суд апраўдаць маю падабаронную і спыніць крымінальную справу"*, — адзначыў адвакат.

У апошнім слове абвінавачаная сказала, што шкадуе пра тое, што адбылося, і што ў касцёл ёй варта было ісці ў іншы дзень.

Суддзя прызнаў Яніну Глазкову вінаватай. Жанчыну асудзілі да **2,5 гадоў "хатняй хіміі"**.

Твитнуть









"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску









## АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022







## Напрамкі дзейнасці

## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY